***Яўген Кавалёў***

# ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ МУЗЕЕФІКАЦЫІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ЧАРНОБЫЛЬСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ БЕЛАРУСІ

Музеефікацыя праяў нематэрыяльнай культуры – перадусім іх захаванне і рэпрэзентацыя шляхам уключэння ў сэнсавую прастору музея. У адрозненне ад прадметаў матэрыяльнай культуры, помнікі культуры духоўнай не валодаюць фізічнымі характарыстыкамі. Таму прэзентацыя музеефікаваных артэфактаў можа ажыццяўляцца як у экспазіцыйна-выставачнай прасторы, так і па-за яе межамі. На сённяшні дзень існуе некалькі спосабаў ўключэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў сэнсавую прастору музея: фіксацыя, рэвіталізацыя, мадэляванне, канструяванне [1, с. 420]. Фіксацыя – пераклад аб'екта з асяроддзя існавання ў стан музейнага аб'екта без істотных змен. Рэвіталізацыя магчымая пры ўмове існавання пераканаўчых доказаў, якія дазваляюць рэканструяваць аб'ект спадчыны на строга навуковай аснове, калі традыцыя яшчэ не забылася цалкам, альбо жывая памяць пра яе. Мадэляванне – поўнае аднаўленне аб'ектаў рэчаіснасці ў выглядзе імітацыі. Канструяванне – гэта выкарыстанне элементаў матэрыяльнай і духоўнай спадчыны для стварэння новых аб'ектаў на аснове распрацаванай музеем канцэпцыі. Спосаб ўключэння ў сэнсавую прастору музея абумоўлівае выбар формы музеефікацыі – тэхнічнага боку працэсу. З пералічаных спосабаў найбольш каштоўным з пункту гледжання захавання аўтэнтычнасці з'яўляецца фіксацыя, якая праводзіцца з дапамогай тэхнічных сродкаў аўдыё-відэазапісу.

Дзейнасць па фіксацыі інфармацыі аб гісторыка-культурных помніках, праявах духоўнай культуры зоны адчужэння насіла рознапланавы характар і ажыццяўлялася супрацоўнікамі Дзяржаўнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, студэнтамі і выкладчыкамі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, навукоўцамі колішняга Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі і іншымі ўстановамі. Фіксаваліся тэхнічнымі сродкамі такія фальклорныя праявы, як прымаўкі, замовы, песні, легенды, павер'і. Значную каштоўнасць уяўляюць запісаныя лінгвістамі інтэрв'ю, узятыя ў перасяленцаў. Як правіла, гэтыя матэрыялы ўяўляюць сабой інфармацыю гісторыка–культуралагічнай і краязнаўчай скіраванасці, якая агучвалася апытуемым з характэрным дыялектнай гучаннем. На аснове гэтых даследаванняў у 1994 г. выйшаў навуковы зборнік «Гавораць чарнобыльцы», прысвечаны лінгвістычным асаблівасцям маўлення жыхароў адселеных тэрыторый.

Матэрыялы экспедыцыйных даследаванняў, накіраваных на фіксацыю праяў духоўнай культуры, знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыі шэрагу фальклорных зборнікаў і матэрыялаў канферэнцый. Найбольшых поспехаў у справе фіксацыі фальклору дасягнула Дзяржаўная экспедыцыя па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў раёнах Беларусі, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Супрацоўнікі гэтай арганізацыі запісалі больш як 3,5 тыс. праяў вуснай народнай творчасці [3, с. 63], 13 магнітафонных касет з прыкладамі мясцовага дыялектнага гучання [4, с. 11]. Дадзены матэрыял пры адпаведнай тэхнічнай апрацоўцы можа стаць асновай для стварэння мультымедыйных праектаў, прызначаных у тым ліку і для прэзентацыі ў экспазіцыі музеяў. Некалькі такіх творчых праетаў было здзейснена яшчэ ў пачатку 1990-х гг.

Так, пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь творчым аб'яднаннем «Белвідэацэнтр» быў зняты 40-хвілінны каляровы відэафільм «Ці застанецца спадчына?». Вартасцю фільма з'яўляецца тое, што для нашчадкаў захаваюцца не толькі натхнёныя твары і ўмелыя рукі народных майстроў у шасці пацярпелых раёнах Магілёўшчыны, але і зафіксаваная тэхналогія колішняга хатняга ткацтва, ганчарнай і бондарскай справы, лозапляцення, разьбы па дрэве, набіўкі дываноў, вышывання і іншых атрыбутаў старажытнабеларускага быту і культуры [4, с. 11]. Таксама быў створаны фільм «На крылах мары» пра Краснапольскі народны тэатр. Акрамя гэтага планавалася зманціраваць шэраг кароткаметражных кінастужак пра народных майстроў і творчыя калектывы, якія пражываюць на адселеных тэрыторыях. Аднак па прычыне недахопу фінансавання за перыяд дзейнасці Дзяржаўнай экспедыцыі (1991-2001) гэтыя планы не былі здзейснены. Таму з улікам усяго аб'ёма зафіксаваных супрацоўнікамі гэтай арганізацыі фальклорных тэкстаў, актуальным з'яўляецца выкарыстанне гэтых матэрыялаў у справе трансляцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны «чарнобыльскага рэгіёну» шляхам стварэння мультымедыйнай прадукцыі і яе далейшай прэзентацыі ў экспазіцыях.

Добрым прыкладам такога спосабу музеефікацыі фальклору можа служыць выстаўка «Народная культура зраненої землі» , арганізаваная ў Кіеве да 10-годзя аварыі на ЧАЭС. Агляд прадстаўленых у экспазіцыі прадметаў этнакультуры ажыццяўляўся з гукавым суправаджэннем — аўдыёзапісамі аўтэнтычных фальклорных тэкстаў з пацярпелых ад катастрофы раёнаў Украінскага Палесся [2, с. 30]. Гэтая адметная рыса арганізацыі выставачнай прасторы дазволіла стварыць асабліві нацыянальны каларыт у экспазіцыі і падкрэсліла генетычную сувязь паміж матэрыяльнай і духоўнай культурай.

На жаль, у Беларусі такая практыка музеефікацыі фальклору пакуль не атрымала распаўсюджвання. Прычыны гэтага заключаюцца ў адсутнасці музея, цалкам прысвечанага этнакультурнай спадчыне чарнобыльскіх тэрыторый і тэхнічнай неабсталяванасці рэгіянальных музеяў, частка экспазіцыі якіх адлюстроўвае трагічныя падзеі красавіка 1986 г. Немалаважным таксама з'яўляецца тое, што на сенняшні дзень не існуе ўстановы, якая б займалася захаваннем і вывучэннем культурнай спадчынай пацярпелых ад аварыі раёнаў, а таксама каардынавала дзейнасць іншых дзяржаўных навуковых установаў у гэтай справе.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

У такіх умовах, асноўным спосабам музеефікацыі нематэрыяльнай спадчыны з'яўляецца жывое выкананне аўтэнтычных фальклорных твораў народнымі калектывамі. Першыя ансамблі, якія ставілі перад сабой задачу трансляцыі фрагментаў духоўнай культуры пацярпелых ад аварыі тэрыторый, пачалі арганізоўваць самі перасяленцы. Напрыклад, у 1994 г. аднавіў сваю работу ансамбль «Вясёлка», які складаўся з былых жыхароў Нараўлянскага раёна. На сённяшні дзень дзейнічае дастатковая колькасць фальклорных спеўных калектываў, рэпертуар якіх часткова ўтрымлівае творы з адселеных тэрыторый. Іх выступленні могуць праходзіць у музеях рознага тыпу (стацыянарных крытых экспазіцыях, музеях-скансэнах), не залежна ад узроўню тэхнічнага абсталявання заляў. Таму гэта найбольш даступны спосаб музейнай прэзентацыі нематэрыяльнай спадчыны пацярпелых раёнаў нашай краіны.

**Спіс літаратуры:**


1. Музейное дело России. / Каулен М. Е., Коссова И. М., Сундиева А. А. – 2-е изд. – М. : ВК, 2005. – 614 с.
2. Полісся України : матеріали іст.-етнограф. дослідж / за ред. С. Павлюка, Р. Омеляшка. – Вип. 3 : У межiрiччi Ужа i Тетерева. 1996. – Львив : Ін-т народознавства НАН Украiны, 2003. – 340 с.
3. Смолік, А. І. Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыўме / А. І. Смолік. – Мінск : Бел. ін-т культуры, 1999. – 245 с.
4. Філістовіч, М. Няма падстаў для аптымізму / М. Філістовіч // Культура. – 1994. – № 6. – С. 8.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ